ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

№ 20 (198)
26 траўня 2001 г.

СТАР. 10-12
TV ПРАГРАМА 28 траўня–3 чэрвеня

СТАР. 3
ПОСЛЕДНИЙ ТИРАН В ЕВРОПЕ
Беларусь в англоязычной прессе

СТАР. 4
ГОРЯЧИЙ МАЙ
Политическая борьба в Польше накануне выборов

СТАР. 5
БОЙКОТ МИРА
Нынешний израильский премьер не намерен уступать палестинцам

СТАР. 6
ШЭСЦЬ ПРЫЧЫНАЎ АБЫЯКАВАСЦІ
Інвестары не ідуць у Беларусь нават пад дулам пісталета

СТАР. 7
ПАВЕЛ КОЗЛОВСКИЙ: АРМИЯ ПРОГОЛОСУЕТ ПРОТИВ ЛУКАШЕНКО
Встреча в редакции еще с одним потенциальным кандидатом в президенты

ПАДЗЕЯ

ХОЦЬ ВЕНІКІ ВЯЖЫ!



НАШ ВЕРНІСАЖ. «Александр Григорьевич Брежнев», художник А. СДВИЖКОВ-ВСЕБЕЛОРУССКИЙ

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

Выступленьне Аляксандра Лукашэнкі на II Усебеларускім народным сходзе абяцала стацца, як заўжды, разьвясёлым. Сьпярша складана было ўтрымацца ад кпінаў зь бязглуздасьці новае праграмы сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця, якая сталася падставай для такога маштабнага мерапрыемства. Але чым радзей Лукашэнка зазіраў у падрыхтаваную паперку, чым больш уважліва народ чытаў эканамічную канцэпцыю, тым меней хацелася сьмяяцца.

Дэлегаты

Менск прымаў нашэсьце з дзьвюх з паловай тысяч дэлегатаў як мог. Для аўтобусаў зь імі пракладалі маршруты, дзе сьветлафоры падмігвалі кіроўцам толькі зялёным вокам, візытэраў сялілі ў гатэлях у цэнтры гораду, да іх увагі прапанавалі канцэрт лепшых, па словах кіраўніка дзяржавы, прадстаўнікоў беларускае культуры.

Лукашэнка аб'вясьціў, што недарма даручыў адкрыць сход міністру Гуляку. Задумана было паказаць, нібыта культура не кінутая на волю лёсу. У пацьверджаньне сваіх слоў, прэзыдэнт указаў на тое, што ніхто з выступоўцаў ня меў на сабе старэнькае сукеначкі. *«Гэта ж шалёных грошай каштуе!»* — жаліўся Лукашэнка, усьведамляючы, аднак, адсутнасьць іншага выйсьця: *«Ня будзем падтрымліваць артыстаў — ператворымся ў бананавую рэспубліку»*.

Дэлегатам паведамілі, што за права выступіць на канцэрце змагаліся сотні калектываў. Насамрэч спабору за нумар у шоу не было. Ансамблям проста паведамілі, дзе й калі іх чакаюць на рэпэтыцыю. Найвышэйшыя дасягненьні беларускае культуры праявіліся ў кульмінацыі імпрэзы. На сцэне зьявіліся тры хоры, каб пастаяць некалькі хвілін перад публікай і паадкрываць роцікі. «Белавеская пушча» гучала ў запісе.

Але дэлегатам спадабалася. Яны пляскалі ў ладкі ад душы. А ранкам наступнага дня яшчэ актыўней. Можа, канцэрт іх сапраўды ўразіў, але 18-га траўня без клакераў не абышлося. Прычым яны часам забываліся на свае абавязкі і сьпяшаліся выканаць норму па аплядысмэнтах пасьля кожнае банальнасці. Шчыра віталі, прыкладам, выслоўе: *«Што думаеце, прэзідэнт пойдзе за вас вырашаць пытаньні вытворчасьці малака і мяса? Даіць кароў і карміць быкоў? Не»*.

Цяперашні стан

Такія сходы заўжды нагадвалі савецкія партыйныя пленумы. Пятнічная дзея ня сталася выключэньнем. Лукашэнка зьвяртаўся выключна да таварышаў. Хаця празь сем год сваіх высілкаў па аднаўленьні савецкае дзяржавы ён зразумеў, што шляху назад да саюзу няма. Ён з сумам згадваў, як ня браў удзелу ў падзеле Чарнаморскага флоту й застаўся голым пасьля распаду СССР.

Мэтадычнае прамываньне народных мазгоў распачалося з канстатацыі таго, што Беларусь жыве ня проста добра, а лепш за ўсіх. Прынамсі ў СНД. Хто б мог падумаць, што за апошнія пяць год беларуская эканаміка ня проста стабілізавалася, а нават стала даваць станоўчыя паказальнікі. Аказваецца, *«вытворчасьць спажывецкіх тавараў узрасла на 81 адсотак, тавараабарот у розьніцы павялічыўся больш як удвая, рэальныя грашовыя даходы насельніцтва павысіліся на 71 адсотак»*. Толькі людзі гэтага шчасьця не адчуваюць. Па праўду далёка хадзіць не давялося. Нягледзячы на ўважлівасьць вертыкалі пры адборы дэлегатаў на зьезд, палова зь іх абвергла б статыстыку. Астатнія, магчыма, і пацьвердзілі б, але не з-за ўласнага досьведу, а з спасылкай на бачанае па БТ.

У адпаведнасьці з дадзенымі складальнікаў праграмы, у мінулым годзе сярэдні заробак працаўнікоў, службоўцаў і калгасьнікаў складаў 83 зь лішкам *USD*. Міністар эканомікі ў апошнія дні мінулага году называў меншую лічбу. Што рабіць, за сем год пры цяперашнім начальніку міністэрствы не навучыліся каардынаваць свае дзеяньні і дамаўляцца аб тым, якія лічбы называць насельнікам.

Абяцаны прэзыдэнтам стольнік ужо ўважаецца за рэальны паказальнік гэтага году, хаця мала хто яго бачыў. Нават калі й раздадуць народу абяцаныя грошы, у наступным годзе падтрымаць дасягнуты ўзровень будзе немагчыма. Абвешчаныя на 2005-ы год дзьве з паловай сотні даляраў хутчэй падобныя на салодкую марковіну, прымацаваную перад ідучым за ёй аслом, чым на рэальныя грошы.

У адпаведнасьці з пунктамі праграмы, шмат высілкаў будзе кінута на ўдасканаленьне адносінаў уласнасьці. Сярод абяцаньняў: далейшае разьвіцьцё дасьледаваньняў у электроніцы, вылічальнай і оптавалаконнай тэхніцы, праграмным забесьпячэньні, тэлекамунікацыях ды інфармацыйных паслугах. Цікава, як атрымаецца ажыцьцявіць усе гэтыя пляны, калі да 2005-га году выдаткі на навуку будуць складаць менш як 2 адсоткі ад ВВП.

Стваральнікі новае праграмы сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця перастараліся з выкананьнем інструкцыяў. Нерэальнасьць выкананьня прадстаўленага на зьезьдзе дакумэнту відавочная. Наўрад ці самі аўтары яе вераць сваім прагнозам. Праграма сталася чыста PRаўскім ходам. Па іх прагнозах, ВВП будзе расьці з хуткасьцю 6-7 адсоткаў у год. Такіх тэмпаў ня памятае нават Японія ў свае лепшыя часы. Але што нам Японія? Беларускі эканамічны цуд самы цудоўны з усіх цудаў!

➲ *Заканчэньне на стар. 3*

ДЫПЛЯМАТЫЯ

Ці вернецца Вік з Бухарэсту?

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

Міністар замежных спраў Міхаіл Хвастоў абвясьціў аб вераг-однасьці таго, што неўзабаве будзе ўзьнятае пытаньне аб дзейнасьці кіраўніка КНГ АБСЭ Ханса-Георга Віка ў Беларусі.

Па меркаваньні Міхал Міхалыча, чыннасьць менавіта гэтага чалавека ёсьць найбольш дыструктыўнай напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў.

Сам Ханс-Георг Вік накіраваўся на мінулым тыдні ў Бухарэст. Калі МЗС возьмецца давесьці свае пагрозы да выкананьня, нямецкі амбасадар можа больш і не вярнуцца ў Беларусь. Самі АБСЭшнікі камэнтаваць заяву Хвастова адмовіліся.

У МЗС перакананыя, што на сёньняшнім этапе дзейнасьці АБСЭ намецілася тэндэнцыя, якая выклікае яўную занепакоенасьць. Па меркаваньні Хвастова, яго ўстанова *«фактычна сутыкаецца са спробамі ператварыць АБСЭ ў інструмэнт заходніх краін па кантролю над новымі дэмакратыямі ва Ўсходняй Эўропе»*. Усхваляванасьць чыноўніцтва тлумачыцца перадусім дзейнасьцю групы ў сфэры рэалізацыі праектаў па арганізацыі ўнутранага назіраньня за прэзыдэнцкімі выбарамі. Пры гэтым сам панятак *«унутранае назіраньне»* для ўраду праблемы не ўяўляе. Хвастоў спасылаўся на выбарчы кодэкс Беларусі, які прадстаўляе ўсе магчымасьці для ўнутранага назіраньня. Аднак яму не спадабалася, што ў часе мінулагодніх парлямэнцкіх выбараў у склад назіральнікаў былі ўлучаныя толькі прадстаўнікі апазыцыі. Забыўся Міхал Міхалыч, што назіраньне — справа добраахвотная, хто хацеў, той пад кабінкамі і сядзеў. Адылі, па афіцыйнай вэрсыі, у Беларусь прыязджалі проста-такі батальёны назіральнікаў з Расіі, Арменіі ды іншых братніх краін. Каму, як ні міністру замежных спраў, аб гэтым памятаць?

Абурэньне МЗС выклікаў той факт, што апазыцыйным назіральнікам плацілі за каратаньне часу ў школах і палацах культуры. Па беларускай канстытуцыі фінансаваньне любое актыўнасьці, зьнітаванае з выбарамі, забараяецца. У кастрычніку, пэўне святкуючы перамогу, аб гэтым факце не згадвалі. Напярэдадні новае выбарчае кампаніі, кампрамат выцягнулі з партфеляў. Цяпер яны заяўляюць, што *«кіраўнік КНГ АБСЭ ў Менску намагаецца аб'яднаць вакол сябе апазыцыю і выступіць у пэўным сэнсе лідэрам»*. КНГ, па меркаваньні М. Хвастова, *«ператварылася ў актора, які грае на палітычнай сцэне Беларусі»*. Мандат групы такога не прадугледжвае. Гэты дакумэнт гарантуе права групы на ажыцьцяўленьне назіраньняў, складаньне справаздачаў, накіроўваньне іх у сакратарыят АБСЭ і супрацоўніцтва (!) зь беларускімі ўладамі.

У Міністэрстве ня супраць прыбываньня групы АБСЭ ў Беларусі. Чыноўніцтва заяўляе аб сваёй гатоўнасьці ўсяляк падтрымліваць імкненьне самое арганізацыі АБСЭ садзейнічаць дэмакратычным працэсам у Беларусі. Але дзейнасьць групы і ўказаньні, якія даюцца кіраўніку, не павінны быць арыентаваныя на праблемы, якія ўзьнікаюць у зьвязку зь дзейнасьцю ўласна кіраўніка. Міхал Міхалыч не дазволіць, каб дзейнасьць была накіраваная супраць ураду.

Ворагам М. Хвастову бачыцца ня толькі немец Вік, але й іншыя асобы, як фізычныя, так і юрыдычныя. Нездарма МЗС робіць усё магчымае, каб пралезьці ў Раду бясьпекі ААН. Гэтае цёплае месьцейка спадабалася Беларусі яшчэ ў сярэдзіне 70-х гадоў, калі яна праціснулася такі ў гэтую арганізацыю. Але проста паўдзельнічаць у працы ААНаўскага савбезу беларускаму чыноўніцтву мала. У іх узьнікла ідэя рэфармаваньня гэтага воргану. У марах — павелічэньне колькасьці прадстаўнікоў Рады бясьпекі і абвяшчэньне яе адзінай арганізацыяй, якая будзе мець права даваць санкцыі на ваенныя дзеяньні на несваёй тэрыторыі. Вельмі падобна на плян нэйтралізацыі NATO.

Разам з гэтым Міхал Міхалыч клапоціцца аб стварэньні поясу добрасуседзтва вакол нашае дзяржавы. У МЗС разумеюць перавагі партнэрскіх стасункаў з усімі навакольнымі краінамі. Стварэньне гэтага поясу абумоўлена неабходнасьцю замацаваньня сувэрэнітэту Беларусі, тэрытарыяльнае цэльнасьці й бясьпекі краіны. Акрамя таго, Беларусь актыўна шукае рынкі збыту сваёй прадукцыі, бо экспарт чарговы раз абвешчаны прыярытэтам, прынамсі ў праграме сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця да 2005-га году. Такая пазыцыя замацавана таксама ў канцэпцыі нацыянальнае бясьпекі. Пояс добрасуседзтва можа ўяўляць сабою шматступенчатую структуру, асноўнымі кампанэнатамі якое выступяць пошук палітычнае талерантнасьці і узаемадзеяньня.

АНЕКДОТ-С

– Чем отличается Всебелорусское собрание от съезда КПСС?

– Очень отличается, потому что коммунистическим делегатам дарили подарки, а президентским – нет.

– На съезде избирали и одобряли членов ЦК, а на собрании только одного Лукашенко.

***

– Правда ли, как было обещано перед референдумом, что в 2001 году в РБ будет в основном построен рыночный социализм?

– Нет, не правда. Вместо этого решено провести Всебелорусское собрание и президентские выборы.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ



«Что вы думаете я пойду доить коров, кормить быков? Я уже свое отдоил»

(А. Лукашенко, речь на II Всебелорусском народном собрании, 18.05.01)

«Наша экономика – это слепок экономики Германии, слепок экономики Франции»

(А. Лукашенко, речь на II Всебелорусском народном собрании, 18.05.01)

«Оставшись после развала СССР без штанов, мы пытались их сшить всем и каждому»

(А. Лукашенко, речь на II Всебелорусском народном собрании, 18.05.01)

НАВІНЫ

АКЦЫІ. Акцыя «Зубра» «Мы прыйшлі» адбылася 20 траўня ў Мінску. Паводле прэс-цэнтра руху, 900 сябраў «Зубра» прайшлі па тратуарах праспекта Скарыны ад Акадэміі навук да плошчы Незалежнасці. Міліцыянты выказвалі недаўменне, але ніякіх захадаў не рабілі, бо зубраўцы не мелі пры сабе ніякай атрыбутыкі. Падобныя трэніровачныя акцыі прайшлі 20 траўня ў шэрагу гарадоў Беларусі. «*Улада павінна ведаць, што ў выпадку нерэгістрацыі адзінага кандыдата яна сутыкнецца з моцным грамадзянскім супрацівам*», – пракаментаваў акцыю адзін з лідэраў «Зубра», які параіў падобныя акцыі праводзіць і іншым апазіцыйным партыям і рухам.

ЗАКЛІК. Сталічны саюз прадпрымальнікаў, а таксама Палата індывідуальных прадпрымальнікаў заклікаюць прадстаўнікоў малога бізнесу аб'яднацца дзеля абароны сваіх інтарэсаў. У сумесным звароце гаворыцца: «*У сённяшніх умовах дыскрымінуюцца правы індывідуальных прадпрымальнікаў. Узрастае колькасць супярэчлівых заканадаўчых актаў, у якіх не ў стане разабрацца не толькі бізнесоўцы, але і кантрольныя органы, прадстаўнікі якіх часта некампетэнтныя ў пытаннях заканадаўства. Чым больш нас будзе аб'яднаных, тым болей шанцаў адстаяць свае законныя правы і інтарэсы*».

СОЙМ. Сойм БНФ «Адраджэньне» адбыўся 19 траўня. Сярод абмеркаваных пытанняў – лёс КРДС, а таксама стасункі КРДС і прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта Беларусі. Кіраўніцтву БНФ даручана на наступным паседжанні кааліцыі дамагчыся прыняцця рашэння аб правядзенні Кангрэсу дэмакратычных сіл, а ў выпадку надзвычайнай сітуацыі вызначыць імя адзінага кандыдата. Сойм прыняў зварот з нагоды сілавых разгонаў акцыяў пратэсту ў дзень Усебеларускага народнага сходу 18 траўня, а таксама заклікаў дэмакратычную апазіцыю назваць імя і аб'яднацца вакол адзінага прэтэндэнта на прэзідэнцкіх выбарах.

АПЫТАННЕ. «*Ці з'яўлецца Беларусь дэмакратычнай дзяржавай?*» З такім пытаннем да беларускіх жыхароў звярнуліся супрацоўнікі Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў падчас агульнанацыянальнага сацыялагічнага апытання. 42 адсотка рэспандэнтаў заявілі, што Беларусь не з'яўляецца дэмакратычнай дзяржавай. 20 – прытрымліваюцца супрацьлеглага меркавання, 38 адсоткаў не змаглі адказаць на пытанне. Акрамя таго, 53 адсотка апытаных лічаць, што ў Беларусі парушаюцца правы чалавека, а 20 – заявілі, што правы чалавека ў нашай краіне не захоўваюцца наогул. 68 адсоткаў апытаных Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў засведчылі, што не маюць дастатковага доступу да інфармацыі пра палітычную сітуацыю ў Беларусі. Кожны трэці адказаў, што задаволены той колькасцю інфармацыі, якую атрымлівае. Прыкладна роўная колькасць рэспандэнтаў – 39 і 34 адсотка адпаведна – адказала, што давяраюць і не давяраюць БТ як крыніцы інфармацыі.

ПРЫСУД. На 15 гадоў пазбаўлення волі асуджаны ў ЗША 24-гадовы студэнт з Беларусі. Аляксей Шахіраў кіраваў аўтамабілем у стане алкагольнага ап'янення, выехаў на сустрэчную паласу, дзе сутыкнуўся з іншым аўтамабілем. У выніку адзін чалавек загінуў, а другі атрымаў раненні. На судзе Аляксей сваю віну прызнаў. Адвакаты лічаць, што пасля адбыцця пакарання яго чакае дэпартацыя на радзіму.

КРУГЛЫ СТОЛ. Неадпаведнасць узроўню коштаў якасці паслугаў з'яўляецца адной з галоўных прычынаў нежадання іншаземцаў наведваць Беларусь – заяўляюць удзельнікі круглага стала «*Праблемы і перспектывы турызму і адпачынку ў Беларусі і за мяжой*», які адбыўся ў Мінску 18 траўня. Паводле прадстаўніка бюро падарожжаў і экскурсій «Мінсктурыст» Аляксандра Закіса, у краіне «*няма нармальнай базы для адпачынку*», адсутнічае належны гатэльны сервіс, слаба развіта турыстычная інфраструктура. Тым часам кошт адпачынку ў Беларусі часам даражэйшы, чым за мяжой. Паводле інфармацыі Мінспорту, у 2000 годзе Беларусь наведала ўсяго каля 60 тысяч іншаземных турыстаў, у той час як беларускія грамадзяне здзейснілі каля мільёна турыстычных паездак за мяжу.

КОШТЫ. Паводле Міністэрства статыстыкі і аналізу, за першы тыдзень траўня рост спажывецкіх коштаў у краіне склаў 1 адсотак. З пачатку году спажывецкія кошты ў Беларусі павялічыліся на 18 адсоткаў.

ВЫТВОРЧЫЯ ФОНДЫ. Мінімум $5 мільярдаў патрэбна беларускай эканоміцы для забеспячэння пашыранага ўзнаўлення вытворчых фондаў, – заявіў беларускі прэм'ер Уладзімер Ярмошын. Для гэтага, на думку прэм'ера, неабходна пераарыентаваць унутраныя рэзервы ў рэальны сектар беларускай эканомікі, а таксама спрыяць прыцягненню замежных інвестыцый. Цяпер жа шмат якія беларускія прадпрыемствы не маюць сродкаў не толькі на пашыранае, але і ўвогуле на ўзнаўленне вытворчых фондаў, выкарыстоўваючы ўсе наяўныя сродкі на разлікі з бюджэтам і выплату заробку. На сёння асноўныя фонды беларускіх прадпрыемстваў зношаны на 76 адсоткаў, у той час як крытычнай з'яўляецца мяжа – 60 адсоткаў.

ВЫБОР–2001

РОЖДЕНИЕ В ПРЯМОМ ЭФИРЕ

АНТОСЬ САКОВИЧ

В понедельник журналистам довелось стать свидетелями создания еще одного «общенародного» движения — *«За новую Беларусь»*. Учредители ставят своей целью изменение власти в стране через поддержку одного из альтернативных Лукашенко кандидатов на предстоящих президентских выборах.

Вообще-то журналисты приглашались на совместную пресс-конференцию «пятерки» – Калякина, Гончарика, Домаша, Чигиря и Козловского. Но, несмотря на то, что кандидаты там также присутствовали, не они стали главными героями мероприятия.

Как сообщил присутствующим ведущий, бывший министр сельского хозяйства Василий Леонов, прямо на глазах у представителей прессы образовывалось новое общественное движение. Необходимость завершения формирования организации в «прямом эфире» Василий Леонов объяснил тем, что сбор подписей под обращением о создании движения был сорван нападением на одного из активистов Ивана Анташкевича. Поздним вечером в субботу неизвестные избили его до потери сознания и похитили личные вещи, в том числе и часть собранных под обращением подписей. Времени на повторную процедуру подписания не было, поэтому и решили проголосовать за текст обращения прямо в присутствии журналистов.

Кто и за что голосовал, правда, так и осталось тайной. Никакой регистрации участников не было. Да и текст обращения, по признанию организаторов, был еще окончательно не согласован, не отредактирован, а некоторые его структурные части нуждались в усилении. Особенно та, что касалась отношения создаваемого движения к суверенитету Беларуси, отношению к сохранению белорусского языка и культуры. Доработать «белорусский вопрос» было поручено представителям творческой интеллигенции Генадзю Буравкину и Нилу Гилевичу. Проголосовали, тем не менее, единогласно. Затем так же быстро произошло выдвижение кандидатов в исполком *«общенародного движения»*, за которых опять проголосовали единогласно и списком. Всего в исполком избрали 11 человек: Василий Леонов (председатель), Иван Анташкевич (заместитель председателя), Вячеслав Оргиш, Иосиф Середич, Генадзь Буравкин, Нил Гилевич, Людмила Карпенко, Евгений Лугин, Анатолий Гуляев и некоторые другие. Со временем к исполкому должны примкнуть и по одному представителю от каждого из пятерки кандидатов. Выбрав исполком, участники учредительного собрания поручили ему озадачиться вопросом о названии движения и согласованием всех документов, после чего и разошлись.

В целом такая кондовая пиар-акция движения *«За новую Беларусь»* оставила после себя много вопросов. С уверенностью можно заявить только то, что *«широкая общественно-политическая коалиция»*, о которой так долго говорили члены подзабытого комитета «Выборы-2001», наконец создана. И эта коалиция как две капли воды похожа на бывший комитет «Выборы-2001». Единственное отличие – теперь с ними и пятерка кандидатов, которую социологи основательно напугали негативными последствиями от ассоциирования их с политическими партиями и КРДС. ■

АКЦИИ

Хроника народного противостояния

ОЛЬГА МИЛОРАДОВИЧ

Состоявшееся 18 мая II Всебелорусское народное собрание стало еще одним камнем преткновения в и без того раздираемом политическими страстями белорусском обществе. В минувшую пятницу протест действием по поводу проведения данного мероприятия заявили представители *«Маладога фронту»*, КХП БНФ и ОГП.

В связи с присутствием на основном рабочем заседании собрания большого количества высокопоставленных государственных чиновников (в том числе и самого президента Лукашенко) меры по охране пятничного мероприятия были предприняты беспрецедентные. За день до заседания с помощью бензопил был прорежен лежащий напротив Дворца республики Александровский парк. Получилось почти по Михалкову: *«А из нашего окна площадь Октябрьская видна...»*

Непосредственно же в день заседания с самого утра большинство парковых скамеек оккупировали так называемые «тихари» – широкоплечие парни в штатском с аккуратными микрофонами на лацканах. Точно такие же «люди в черном» стояли по одному через каждые пять-семь метров вдоль наиболее горячего участка проспекта – от здания КГБ до сквера Янки Купалы, а также сидели в автобусах и легковушках с тонированными стеклами во всех прилегающих к площади дворах и подворотнях, мелькали в витринах «Центрального» и «Патио Пиццы».

Нет ничего удивительного в том, что при такой расстановке сил локальные очаги протеста оппозиции, симптоматически вспыхивавшие в этот день на проспекте Скорины, нейтрализовывались буквально в первые минуты своего возникновения. Недовольная оппозиция ну никак не вписывалась в показательно-демократический формат мероприятия, и потому, похоже, с вышколенных людей в штатском были сняты все ограничения. Единственным применяемым в этот день средством урегулирования конфликтов были силовые методы воздействия. Недовольным заламывали и выкручивали руки, их хватали за волосы и били ногами. Все это, повторимся, происходило с молниеносной оперативностью.

Участники пикета, выставленного КХП БНФ аккурат перед Дворцом республики, оказались в «воронке», не успев даже развернуть принесенные с собой транспаранты. Не менее стремительным был и захват ряженых молодофронтовцев. В Международный день музеев, на который пришлось проведение II Всебелорусского народного собрания, активисты МФ в образах Ленина, Дзержинского и Гитлера в сопровождении бравурной пионерско-комсомольской массовки попытались оживить музей восковых фигур, чтобы *«законсервировать в нем культ личности Лукашенко и нынешний режим»*. Живого Гитлера журналистам, впрочем, повидать не довелось: фюрера повязали где-то на подходах к основному месту проведения акции – пятачку возле ресторана «МакДональдс».

➲ *Окончание на стр. 8*

РЭГІЁНЫ

БРЭСТ

У выніку ўраганнага ветру, які абрынуўся на Берасцейскую вобласць мінулымі выхаднымі, пацярпелі 130 гектараў збожжавых, з дахаў дамоў і фермаў сарвала 1300 лістоў шыферу. Паводле прэс-службы ўпраўлення Міністэрства надзвычайных сітуацый, з хуткасцю 20 метраў за секунду, ураган прайшоўся па Бярозаўскім, Ляхавіцкім, Камянецкім, Пружанскім, Баранавіцкім, Івацэвіцкім, Іванаўскім і Драгічынскім раёнах. Апроч таго, чатыры раёны Берасцейшчыны – Ганцавіцкі, Баранавіцкі, Лунінецкі ды Івацэвіцкі – пацярпелі на мінулым тыдні ад замаразкаў. Слупок тэрмометра ў асобныя ночы тут апускаўся да 7 градусаў марозу, а ў калгасе «Расія» – да 18. У выніку ў гаспадарках Берасцейшчыны пашкоджаны 3,5 тысячы гектараў пасеваў, 88 гектараў загінулі.

ГОМЕЛЬ

Падчас судовага паседжання па справе былога рэктара Гомельскага медінстытута Юрыя Бандажэўскага ў панядзелак адвакат падсуднага Аляксандр Баранаў зачытаў зварот дэпутатаў Еўрапарламента да Аляксандра Лукашэнкі. У пасланні, падпісаным віцэ-прэзідэнтам Мары Анн Ізлер Бэгэнам, парламентары заклікаюць кіраўніка Беларусі «*захоўваць справядлівасць да справы Бандажэўскага*». Паводле Баранава, абвінавачанне ягонага падсуднага ў карупцыі «*выклікала ў Заходняй Еўропе недавер і незадаволенасць*». Адвакат па-ранейшаму сцвярджае, што «*справа Бандажэўскага мае заказны характар з-за ягоных даследаванняў уплыву радыяцыі на здароўе чалавека, якія разбураюць афіцыйную версію вынікаў аварыі на ЧАЭС*».

МАГІЛЁЎ

Эколагі адзначаюць небяспечную экалагічную сітуацыю ў Магілёве. Праведзеныя ў красавіку даследы выявілі ў паветры абласнога цэнтра перавышэнне санітарных нормаў утрымання фармальдэгіду на 30 адсоткаў, а серавугляроду – на 70. Таксама фіксавалася высокая канцэнтрацыя аміяку і дыяксіду азоту.

ГРОДНА

У Гарадзенскім раёне ўведзены курортны збор для наведнікаў санаторыяў ды іншых месцаў адпачынку. Падатак вымяраецца 3 адсоткамі ад кошту пуцёўкі ці 10 адсоткамі ад мінімалкі за тры дні так званага неарганізаванага адпачынку. Ад падатку вызвалены дзеці да 16 гадоў ды інваліды вайны і працы.

Старшыня віцебскай арганізацыі АГП Алена Залеская выступіла ў якасці манекеншчыцы на Міжнародным конкурсе мадэльераў-дызайнераў «Белая амфара», які скончыўся 20 траўня. Алена Залеская прадэманстравала на подыюме калекцыю трыкатажнага адзення для жанчын віцебскага прадпрыемства «КІМ».

С ДРУГОГО БЕРЕГА

ПОСЛЕДНИЙ ТИРАН В ЕВРОПЕ

Беларусь в англоязычной прессе

СЕРГЕЙ КОРОЛЬ,
Филадельфия

Первое впечатление после беглого просмотра англоязычной прессы: белорусский феномен не есть мистическое отклонение от реформенного процесса в бывшем СССР. Напротив, он — вполне симптоматичный пример постсоветского развития, вызванного стечением исторических и экономических факторов, усиленных внешней политикой России в СНГ.



Постсоветский провал

Каковы глубинные причины того, что, по выражению «Нью-Йорк Таймс», «*эта страна перешла от строительства демократии к авторитаризму так быстро и так охотно*»? Кто финансирует режим и, соответственно, каковы подлинные интересы России в Беларуси? Какова роль Беларуси в России, Украине и Молдове, и насколько там возможен белорусский сценарий? И наконец, сможет ли укрепившаяся оппозиция, которой противостоит десятилетиями затравленное сознание гомо советикус, воспользоваться нарастающим недовольством для возвращения страны на европейские рельсы?

Именно симптоматичность Беларуси и возможности перемен в ней стали во главу внимания британского «Экономиста», который сразу после парламентских выборов посвятил две статьи анализу двух «*постсоветских провалов*» — Беларуси и Украине. «*Фальшивые результаты фальшивых выборов в фальшивый парламент — другими словами, все как обычно в несчастной Беларуси*». «Экономист», выступающий под девизом «*критикуй политиков справа, слева и в центре*», скуп на похвалу. Тем не менее, журнал отметил относительный успех бойкота и, главное, четкую работу оппозиционных наблюдателей по сбору «*доказательств обмана*». Заметили обычно скептичные авторы и проявления недовольства режимом, в частности брожение среди профсоюзов. Оппозиция окрепла и консолидировалась: «*даже либералы (российского типа) сейчас за независимость*», — процировал журнал Андрея Санникова.

С другой стороны, «*разочарованный, изолированный, но по-прежнему сильный Лукашенко*» снова доказал: чтобы выигрывать, не обязательно играть по правилам.

Внешний фактор

Наметились «*четкие различия по белорусскому вопросу*» между США и Германией. «*Офисом ОБСЕ в Минске руководит немецкий дипломат Ханс-Георг Вик. Он проповедует терпение и вовлечение властей в сотрудничество*» и переговоры как единственно возможный путь. Американцы же — сторонники более жесткого подхода. Некоторым из них «*борьба за демократию в Беларуси представляется даже первой схваткой в новой холодной войне с Россией*».

До осени перед Беларусью стоят, по мнению журнала, три вопроса: «*Сможет ли оппозиция сплотиться вокруг сильного кандидата? Если да, то как ответит Лукашенко? Какой курс в отношении своего трудного и постыдного соседа выберет Россия?*». Ссылки на Югославию полезны, но не точны, комментирует журнал. Минск — не Белград: «*люди более апатичны, национальный дух слабее. Растущая бедность делает людей угрюмее, но пока Россия поставляет дешевую энергию, экономика не рухнет*».

«Нью-Йорк Таймс» отреагировала на выборы лаконичной, но четкой редакционной статьей «Последний тиран Европы». Кратко изложив политику Лукашенко на выборах и его методы в целом, оценив белорусского диктатора как более жесткого, чем даже Милошевич, газета перешла к анализу роли внешних сил в политической ситуации в Беларуси в преддверии грядущих выборов. «*Его отношения с Москвой — ключ к удержанию власти. Беларусь предоставляет Москве радары ПВО на новой границе НАТО и возможность безопасно и надежно проложить газопровод из России на Запад. Если две страны объединятся, Россия сможет далее усилить военное присутствие в Беларуси, а также удовлетворить мечты тех в России, кто по-прежнему мечтает о восстановлении Советского Союза*».

В безусловной поддержке режима Москвой автор не сомневается — еще под свежим впечатлением от тогдашнего путинского поздравления с демократическими выборами. «*Такая поддержка защищает Лукашенко от давления со стороны других стран, придавая его режиму имидж законности и подпитывая его экономику дешевой энергией*». Странен и более тревожен, отмечает газета, «*флирт с Лукашенко Германии. Немецкие дипломаты пропагандируют немецкие инвестиции и вовлечение правительства в диалог. До тех пор, пока Москва на стороне Лукашенко, полагают в Германии, нам следует с ним работать*».

И все же, при всех своих интересах, считает газета, Москва вполне может себе позволить разрешить белорусам выбрать нового лидера — никто из ведущих оппозиционеров не отрицает необходимости тесных отношений с Россией, а вот союз с нереформированной Беларусью может нанести урон российской экономике. В самой же Беларуси объединение оппозиции остается «*единственным шансом превратить наметившуюся фрустрацию избирателей в политическую силу на предстоящих выборах*».

Белорусский синдром

Еще через месяц «Нью-Йорк Таймс» вышла с огромной, больше разворота, статьей «Снова в СССР». Несмотря на броское название, статье чужда упрощенная трактовка. Напротив, автор пытается разобраться, что же произошло в этой, казалось бы, образованной стране, что еще семь лет назад двигалась в направлении Европы. И если авторов послевыборной передовой волновала роль России в Беларуси, корреспондет Майкл Бжезински изучает собственно белорусский синдром и его роль в России. Не прибегая к тонкостям политологии, корреспондет пробует понять Беларусь, полагаясь на личные наблюдения и километры пленки, записанной в разговорах с людьми — от полуобразованных сторонников «*белорусского де Голля*», как выразился один из собеседников корреспондента, до представителей оппозиции и иностранных экспертов.

Корреспондет, человек необычайно общительный, начал свое турне с посещения торжеств в театре Музкомедии 7 ноября. Там он и познакомился с врачом мазовской поликлиники и ярым «*голлистом*», а через него — с целой чередой обыкновенных белорусов как сторонников, так и противников режима. «Музыкальная комедия» 7 ноября и его ночные разговоры под коньяк с некогда демократом, но позже разочаровавшимся в капитализме врачом, добавляют статье драматизма. События последних семи лет воспроизведены исторически точно и с печальной правдивостью.

Из всех возможных ценностей современной цивилизации «*люди здесь больше всего ценят порядок*», — цитирует корреспондент Валерия Фадеева, а далее — Карла Дагенхарта из Международной финансовой корпорации: «*спрос на дешевую водку оказался сильнее спроса на гражданское общество*». Отмечает автор и былую фрустрацию населения первыми ростками искаженного капитализма — коррумпированной номенклатурой, «*паразитами-банкирами*» и растущей преступностью эпохи Кебича.

В отличие от своих коллег по газете, что также часто пишут статьи в рубрику «Минский дневник», корреспондент преувеличивает достижения Лукашенко как народного спасителя. Он не видит, что за социалистическим фасадом народного режима скрываются все те же пороки первобытного капитализма, только в государсвенной упаковке. Что порядок относителен, и что административная экономика Беларуси обеспечивает народ Беларуси хуже, чем рыночная экономика уже практически всех соседей. Что система субсидирования дает сбои, а шефство банков над колхозами последним явно не помогло. Что цены растут, а зарплаты и пенсии падают. И что время, когда Беларусь выгодно отличалась от России своим пенсионно-зарплатным процветанием, уже прошло.

История и водка

Гораздо точнее удается корреспонденту нащупать глубинные причины белорусского синдрома. «*Уникальная история Беларуси*, — цитирует автор Карла Дагенхарта, — *сделала ее особенно восприимчивой к авторитарному правлению*». Тяжелый исторический опыт жизни на перекрестке завоевательных походов и несформировавшаяся национальная идентификация привели к тому, что белорусы считают золотым веком период, «*когда республика служила сборочным цехом советской империи*». И диктаторский режим умело эксплуатирует этот менталитет — от вселукашенковского телевидения до «*самых деструктивных*» методов советского управления — спаивания людей.

«*В прошлом году, когда цена водки выросла, президент выступил по телевидению и объявил о повышении зарплат*, — цитирует корреспондент другого мазовского врача, противника коммунистической реставрации. — *За 32 года работы здесь я никогда не видел такого неистового алкоголизма. Каждый день принимаю по 50 пациентов, которых вынесли с конвейера в состоянии клинического опьянения*». Не обходится и без силового давления. Его корреспондент ощутил на себе — сначала мазовский гебист чуть не разбил ему камеру, а потом пригрозил сгноить живьем на территории предприятия.

Политический бартер

Внешняя поддержка — вторая главная причина живучести режима. По оценке американских экспертов, расходы России на поддержку шаткой экономики Беларуси, главным образом в виде дешевых энергоносителей, составляют от 500 миллионов до 2 миллиардов долларов в год. В ответ Минск выполняет для Москвы грязную работу — продажу оружия изолированным режимам типа Ирака и Ливии. Жесткое обращение с диссидентами в Беларуси также отвлекает критику правозащитных организаций от Москвы. Как отметил представитель госдепартамента: «*Российские дипломаты могут искренне показать пальцем на Лукашенко и сказать — по крайней мере мы лучше белорусов!*»

Возможно ли белорусско-российское объединение и реализация амбиций Лукашенко на объединенный престол? Маловероятно, отмечает корреспондент, ссылаясь на шок, испытанный Лукашенко при назначении Путина. «*Очевидно, что места для двух сильных славянских лидеров нет. Отношения между Лукашенко и Путиным остаются холодными*». Платформа Путина, основанная на сильном руководстве, внешне похожа на платформу Лукашенко, и Путин не потерпит конкуренции. Есть и другое сходство — отсутствие любви к свободной прессе, страсть к спортивным шоу и свободное использование насилия — в Чечне ли или на улицах Минска. Но «*этого недостаточно, чтобы заключить, что российский лидер последует белорусскому примеру до логического конца*».

Слишком сложен российский политический ландшафт, слишком много противоборствующих группировок с деньгами и властью — слишком многим есть что терять. И хотя ситуацию в Беларуси, как отмечают многие западные авторы, следует сравнивать не с Москвой, а с регионами России, дороги постсоветских Беларуси и России разошлись слишком далеко. За разговорами о славянском братстве все более отчетливо стоит просто практическое использование Москвой внутренней специфики Беларуси в своих собственных целях.

Сама же Беларусь, «*при всей своей отсталости*, — как пишет «Нью-Йорк Таймс», — *далеко не Советский Союз. Шлюзы, открытые в 91-м, не удалось до конца закрыть... Многие начинают понимать, что в возвращении к прошлому будущего нет*».

Но путь от прошлого к будущему не будет легким, и затяжная перспектива маленькой диктатуры на окраинах Европы кажется все менее странной, если и не менее печальной. ■

ПАДЗЕЯ

Хоць венікі вяжы!

Заканчэнне. Пачатак на стар. 1

Ягоную выкшталцонасьць можа сапсаваць хіба толькі нізкі ўзровень рэнтабэльнасьці прадукцыі ў рэалізацыі і маруднасьць абнаўленьне асноўных фондаў. Між тым, калі асноўныя фонды недзе і абнаўляюцца, дык на агульную карціну пагаршэньня рэспубліканскіх паказальнікаў гэта не ўплывае.

Што да якасьці, дык няма сумненьняў, «*нашая прадукцыя выкшталцонае якасьці*». Аб гэтым Лукашэнка можа заяўляць абсалютна аўтарытэтна, бо ён «*аб'ехаў увесь сьвет, быў і ў Расіі, і паўсюль*». Дзе «*паўсюль*» беларускі лідэр удакладняць ня стаў. У прыстойныя краіны з афіцыйным візытам яго не запрашаюць. А калі й вызавуць на які-небудзь міжнародны саміт, дык за адзін стол зь ім ня сядуць і пакарміць яго забудуцца.

Пра стасункі з суседзямі

Цывілізаваны сьвет надакучыў прэзыдэнту да немагчымасьці. Асабліва дэмакратычная Эўропа. «*Можа, хацелася б заплюшчыць вочы і ўявіць на імгненьне, нібыта Эўропы няма. Але яна ёсьць. Яна бяз нас абыдзецца, мы безь яе — не*», — роспачна канстатаваў кіраўнік Беларусі. Ён каторы раз нагадаў прысутным, што суседзяў не абіраюць, яны дадзеныя не кімнебудзь, а Госпадам Богам. Зь імі трэба падтрымліваць сяброўскія стасункі. Але як можна сябраваць з Паўночна-Атлянтычным альянсам, вышэй лукашэнкавага разуменьня. «*NATO гэта ня той блёк, зь якім можна ісьці ў абдымку. Ён нам яшчэ пакажа*». І няхай не праводзяць яны ў год прэзыдэнцкіх выбараў свае вучэньні проста ля беларускае мяжы. Мы ж таксама не лапцямі мачанку сёрбаем. «*Мы ня можам сабе дазволіць, каб нас піналі нагамі. Вы праводзіце вучэньні, мы правядзем вучэньні*».

А пакуль армія да вучэньняў рыхтуецца, унутраныя службы адлоўліваюць шпіёнаў. За апошнія месяцы дваіх дывэрсантаў зь Беларусі выкінулі. Яшчэ двое сядзяць цяпер у сьледчых ізалятарах і даюць паказаньні. На ўвесь сьвет аб гэтым крычаць Лукашэнка ня лічыць мэтазгодным. «*Але папаліся, няхай адказваюць*».

Вінаватых пакараць

На шляху да сьветлае будучыні, якая надыдзе не пазьней 2005-га году, перашкоды ствараюць ня толькі ворагі зьнешнія, але і ўнутраныя. Лукашэнка намагаўся пераканаць прысутных у тым, што «*ня мы стварылі гэты час вельмі цяжкі, і ўсе гэта разумеюць*». Але нехта павінен адказваць за тое, што гарантаваны народу дабрабыт усё не набліжаецца. Лукашэнка ня мог злавацца занадта моцна — стрымліваў эмоцыі перад электаратам. Таму на арэхі дасталася хіба Нацбанку за сытуацыю зь Белбалтыяй і Белкамбанкам. Гэта, па словах Лукашэнкі, было не «*галавацяпства*», а звычайны недагляд. Гэта Пракаповіч не пракантраляваў адсоткавыя стаўкі, якія абяцалі кліентам хуткія і важкія прыбыткі. Іншая справа — сістэмаўтвараючыя, лічы — дзяржаўны банкі. Там кантралёраў як сабак. Таму самі працаўнікі змушаныя разрывацца між сваімі непасрэднымі абавязкамі і напісаньнем справаздач для праверак і куратараў.

Пагразіў пальцам Лукашэнка і міністэрству аховы здароўя. Гэтаму дасталася за грубыя парушэньні фінансавае дысцыпліны.

А завод «Гарызонт» няма чым папракнуць. У адрас тамтэйшага дырэктара гучалі адзінае словы падзякі. Некалькі год таму яму далі загад: «*Хоць венікі вяжы, не выганяй людзей з «Гарызонту»*». Дырэктыва затармазіла натуральныя працэсы перакваліфікацыі пэрсаналу. Народ не ўважаў за неабходнасьць шукаць свайго месца ў рэальным сэктары эканомікі. Неўзабаве ім сапраўды давядзецца плесьці мяцёлкі. Калі не на «Гарызонце», дык на іншых стратных прадпрыемствах.

У працяг абмеркаваньня эканамічнае сытуацыі Лукашэнка зьвярнуўся да кіраўнікоў айчынных прадпрыемстваў. Па ягоных словах, «*нам няма чаго раўняцца на Расію, бо гэта багатая краіна*». Занябёсныя заробкі расійскіх прамыславікоў, чые прадпрыемствы стаяць, Лукашэнкам ацэньваюцца ад паловы да дзьвюх тысяч *USD*. Каб узьняць настрой сваім падначаленым, ён паабяцаў, што прыйшоўшы ў ягоную каманду нехта пачне зарабляць па тысячы далараў.

А заўтра...

Лукашэнка абмовіўся аб тым, што больш як тры прыярытэты нашая краіна не пацягне. Няўважліва ён чытаў распрацаваны для яго дакумэнт. Ён утрымлівае пяць прыярытэтных накірункаў разьвіцьця эканомікі. Акрамя клясычных экспарту, жыльлёвага будаўніцтва і забесьпячэньня харчовае бясьпекі, пад асаблівую ўвагу трапляе ахова здароўя і актывізацыя інавацыйнае ды інвэстыцыйнае дзейнасьці.

«*Калі мы ня будзем павышаць пэнсыі і заработную плату, мы будзем зьмецены: я, улада*». Перад міністэрствам і ўрадам пастаўлена задача: стварацъ цэнтры для высакаклясных адмыслоўцаў ад мэдыцыны.

Пра выбары

Лукашэнка абверг відавочнасьць таго, што гэты зьезд быў прымеркаваны да прэзыдэнцкіх выбараў. Маўляў, маштабных мерапрыемстваў для перамогі ўвосень яму не патрэбна. «*Уладу ўтрымаць сёньня не праблема*», — паведаміў цяпершні прэзыдэнт. «*Але рукі спусця выбары правадзіць мы не павінны. Калі мы апусьцім рукі, мы аддадзім уладу купцы шарлатанаў*». У той жа час злоснаму Захаду прыпісалі ўсьведамленьне таго, што «*ў нас прэзыдэнцкія выбары ня выйграць*». Варта толькі папрасіць падтрымкі ў людзей.

Ці то клакеры зноў праспалі, ці то людзі прапусьцілі камплемэнт наконт самага таленавітага і разумнага народу ў сьвеце між вушэй, толькі авацыі гэтая заява ня выклікала.

НОВОСТИ СНГ

МОЛДАВИЯ. Вопреки мрачным прогнозам, состоялась запланированная встреча в Тирасполе между президентом Молдавии Владимиром Ворониным и лидером Приднестровья Игорем Смирновым. Накануне встречи молдавский президент объявил решение приднестровской проблемы первоочередной и особо важной задачей. По некоторым вопросам на переговорах был достигнут определенный прогресс: были подписаны соглашения о гармонизации налогового и таможенного законодательств; о защите инвестиций; о взаимном признании документов, выдаваемых в Молдавии и Приднестровье; о распространении приднестровских и молдавских СМИ на обоих берегах Днестра. Теперь решено наладить обоюдную трансляцию, совместное производство и обмен теле- и радиопрограммами, а также организацию теле- и радиомостов, круглых столов, благоприятствующих установлению контактов между обоими берегами Днестра, обеспечить взаимное распространение периодических изданий. Между тем, Тирасполь не отказывается от своих требований принести извинения за военную операцию против Приднестровья, проведенную летом 1992 года, и возмещения материального ущерба, оцениваемого в 70 миллионов долларов.

УКРАИНА. Украинская оппозиция торжественно отметила день рождение пропавшего журналиста Георгия Гонгадзе. Члены антипрезидентской оппозиции установили на центральной улице Киева – Крещатике – памятник погибшим журналистам. Первоначально оппозиция собиралась установить памятник возле здания администрации президента на улице Банковской, однако отказались от этой идеи, после того как власти стянули туда усиленные отряды милиции. Предполагалось также переименовать улицу Банковскую в улицу Гонгадзе. Оппозиционеры, в большинстве своем члены Социалистической партии Украины, привезли и смонтировали на тротуаре двухметровую стелу из черного гранита. На ней высечены имена девяти журналистов, убитых или пропавших без вести за последние 9 лет. Первым из них значится имя Георгия Гонгадзе. «*Памятник, который мы видим, – это отражение положения прессы в нашей стране*», – заявил после открытия памятника лидер социалистов Александр Мороз. В рамках акции также прошел митинг и концерт.

КАЗАХСТАН. Несмотря на протесты общественности, президент Казахстана Нурсултан Назарбаев подписал указ о проведении акции по легализации денег в соответствии с принятым ранее законом «Об амнистии граждан в связи с легализацией денег». Как сообщили агентству *KZ-today* в пресс-службе главы государства, период начала легализации установлен с 14 июня. По закону процесс легализации капиталов продлится 20 дней. Главная цель закона – вернуть уплывшие за границу деньги. По самым оптимистичным прогнозам, правительство планирует вернуть 500 миллионов долларов. Независимые источники называет совершенно другую цифру «теневого экспорта капиталов» – 10–15 миллиардов долларов и вполне обоснованно сомневается в возврате денег, украденных за десять лет дикой приватизации. Представители оппозиции обратились к международной общественности по поводу вызывающих действий режима президента Назарбаева. «Заявление 33-х», с которым ведущие политики Казахстана обратились в Конгресс США по поводу принадлежащих президенту и членам его семьи счетов в западных банках, станет вскоре предметом обсуждения в подкомитете по коррупции и контролю за незаконными капиталами финансового комитета американского парламента. Данный документ расширяет географию полемики и призван, очевидно, привлечь внимание политиков и правоохранительных органов не только США, но и объединенной Европы, к демонстративному сращиванию власти и преступности в Казахстане.

ТАДЖИКИСТАН. Президент Таджикистана Эмомали Рахмонов наращивает дипломатические контакты с целью получения дополнительной финансовой помощи. Недавно он побывал с визитом в Токио, где прошла международная конференция стран-доноров Таджикистана, к числу которых относятся США, Япония и ЕС. Япония по-прежнему намерена оказывать содействие в восстановлении Таджикистана после гражданской войны. Токио предоставит Таджикистану безвозмездную финансовую помощь на сумму 2,5 миллиарда иен. В свою очередь, участники консультативной группы стран-доноров Таджикистана подтвердили свое намерение выделить стране 430 миллиона долларов. Кроме того, совсем недавно о своих намерениях наращивать сотрудничество с Таджикистаном для поддержания региональной безопасности, совместной борьбы с международным терроризмом, религиозным экстремизмом и незаконным оборотом наркотиков объявила Индия, которая готова предоставить Душанбе грант на 5 миллионов долларов. Кроме того, лидер Таджикистана выразил готовность присоединиться к программе НАТО «Партнерство во имя мира». Бесчинства талибов в соседнем Афганистане позволяют Таджикистану рассчитывать на все возрастающую международную помощь.

СОСЕДИ

ГОРЯЧИЙ МАЙ
в преддверии осенних выборов

АНДРЕЙ ОДЛЯНИЦКИЙ

Начало мая всегда было горячим для польских политиков. И в этом нет ничего удивительного, ведь уже первые дни месяца приносят своеобразное соревнование праздников, каждый раз напоминающее смотр сил, эдакую игру политическими мускулами.

Дело в том, что польские левые традиционно отмечают 1 мая массовыми демонстрациями и митингами. Во времена коммунистической диктатуры «Солидарность» организовывала в этот день независимые контр-демонстрации, но с момента обретения Польшей независимости правые отказались от организации 1 мая каких-либо манифестаций, вместо этого они предпочитают отмечать 3 мая принятие первой конституции Польши. Короткий перерыв между этими датами только разжигает страсти. В газетах еще несколько лет назад делались прогнозы о том, кому удастся вывести на улицы больше людей, какое празднование окажется более грандиозным и т. д.

В этом году Первомай однозначно победил. Массовые демонстрации, организованные левыми, прошли по всей стране. Не было даже традиционных столкновений с ультраправыми, которые ежегодно пытаются таким образом заявить о своем существовании. Похоже, общий упадок правых, которые за последние несколько лет утратили общественную поддержку, даже на них подействовал удручающе.

Ко всему прочему, в этом году именно в мае фактически началась предвыборная борьба. Проведенная в Польше реформа административно-территориального деления требовала внесения изменений в избирательное законодательство. Однако то, какие изменения были внесены в избирательный закон, указывает, что депутаты при его принятии руководствовались не только желанием избежать путаницы, но и сугубо партийными интересами.

